# ДНІ ДЫЗАЙНУ ПРАЙШЛІ Ў ВДУ

***У сярэдзіне лістапада ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта нашага ўніверсітэта адбылося ўзнагароджанне пераможцаў Міжнароднай выставы-конкурсу «Дні дызайну 2022» і адкрыццё выставы творчых работ яе ўдзельнікаў.***

Юлія Бежанар, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прарэктар па выхаваўчай рабоце ВДУ, на конкурсе выступала ў якасці члена журы.

– Ужо не першы год мастацка-графічны факультэт становіцца пляцоўкай, якая аб'ядноўвае ўсіх неабыякавых да мастацтва людзей – дызайнераў, мастакоў, педагогаў. Прызнаюся, ацэньваць аб'ектыўна такую вялікую колькасць работ, прадстаўленых у кожнай намінацыі, было няпроста. Аднак члены журы падышлі да сваёй працы адказна, таму, думаю, усе ўдзельнікі засталіся задаволенымі. Я віншую ўдзельнікаў і пераможцаў конкурсу з такой значнай падзеяй у іх жыцці, а арганізатарам мерапрыемства дзякую за іх працу, – расказала Юлія Пятроўна.

Па словах Валерыя Кулянёнка, кандыдата педагагічных навук, дацэнта, загадчыка кафедры дызайну, аднаго з арганізатараў мерапрыемства, Міжнародная выстава-конкурс «Дні дызайну 2022» праводзіцца з мэтай паглядзець узровень развіцця юных дызайнераў, каб даведацца, у якіх напрамках яны больш працуюць. А для саміх студэнтаў – гэта выдатная магчымасць праверыць свае творчыя сілы і паказаць сябе.

Алена Сакалова, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дэкан мастацка-графічнага факультэта:

– Я ведаю, якая вялікая работа была праведзена арганізатарамі. Дзякуй вам за гэта. Для студэнтаў удзел у падобных мерапрыемствах – гэта практыка, а любая практыка – гэта вопыт, таму не засмучайцеся, калі вы не атрымалі перамогу. Тварыце і не саромейцеся ўдзельнічаць у розных конкурсах. Жадаю ўсім творчых дасягненняў, рэалізацыі ідэй і здароўя, – адзначыла Алена Алегаўна.

Дар'я Шыянава і Анастасія Саўчанка, студэнткі 2 курса МГФ (спецыяльнасць «Дызайн»), пераможцы ў намінацыі «Макет»:

– За аснову нашай працы мы ўзялі архітэктурны будынак і зрабілі свой макет, які ўяўляе сабой выставачны комплекс. Выкарыстоўвалі такія матэрыялы, як пластык і папера. Праца заняла каля двух тыдняў. Для нас удзел у конкурсе – гэта каштоўны вопыт, які абавязкова спатрэбіцца ў будучыні, у тым ліку і для вучобы. Мы не разлічвалі, што станем лепшымі ў сваёй намінацыі, але перамозе вельмі рады.

Варта адзначыць, што ў гэтым годзе ў ліку намінацый з'явілася «навінка» – «Першы крок» – спецыяльная намінацыя для навучэнцаў дзіцячых мастацкіх школ, якія, дзякуючы ўдзелу ў конкурсе, змаглі ўбачыць, да чаго можна прыйсці і чаго дабіцца, калі ў будучым выбраць для паступлення ВДУ імя П.М. Машэрава.

**Вікторыя АЛЯКСАНДРАВА.**
**Здымак Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

